**24.** Выберыце правільна напісаны сказ.
*1) Шасцёра студэнтаў прынесла падручнікі ў бібліятэку.*
*2) Неўзабаве на прыпынак падышло чалавек з восем.*
*3) Тры месяцы мінулі з пачатку дыпломнай работы.*
**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**25.** Жанрам якога функцыянальнага стылю з'яўляецца *даведка*?
**А)** мастацкага. **Б)** гутарковага. **В)** публіцыстычнага.
**Г)** афіцыйна-дзелавога. **Д)** навуковага.

**26.** Хто з мастакоў слова мае літаратурны псеўданім Валошка Максім?
**А)** Анатоль Бутэвіч. **Б)** Алесь Разанаў. **В)** Уладзімір Караткевіч.
**Г)** Андрэй Макаёнак. **Д)** Аркадзь Куляшоў.

**27.** У старажытнасці ткалі, вышывалі, кавалі своеасаблівыя фігуры, якія з'яўляліся адлюстраваннем чатырох стыхій прыроды і мелі падабенства з пэўнымі геаметрычнымі фігурамі. Суаднясіце назвы з фігурамі.

| | |
|---|---|
| *1) зямля;* | *а) трохвугольнік;* |
| *2) вада;* | *б) крыж унутры круга;* |
| *3) агонь;* | *в) круг;* |
| *4) паветра.* | *г) прамавугольнік;* |
| | *д) квадрат.* |

**А)** 1-а, 2-д, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-д, 4-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-д.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

**28.** Гэты выдатны дзяржаўны дзеяч, мастак слова, вучоны-прыродазнавец, філосаф упершыню выкарыстаў слова *марфалогія* як тэрмін. Пра каго ідзе гаворка? Гэта … .
**А)** А. Абуховіч. **Б)** М. Карамзін. **В)** А. Бялыніцкі-Біруля.
**Г)** В. Гётэ. **Д)** І. Гашкевіч.

**29.** Першая ўніверсальная Беларуская энцыклапедыя (Бел СЭ) выйшла ў 1969-1975 гадах. Гэта выданне ўключала каля 35 тысяч тэрмінаў. Колькі тамоў Бел СЭ было выдадзена ў тыя гады?
**А)** 10. **Б)** 12. **В)** 14. **Г)** 16. **Д)** 18.

**30.** Хто з мастакоў слова з'яўляецца аўтарам вершаванага радка: "Захавай маю мову, чарговы наш век…"
**А)** Г. Бураўкін. **Б)** М. Стральцоў. **В)** С. Грахоўскі.
**Г)** Н. Гілевіч. **Д)** Н. Гальпяровіч.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 17. Тыраж 15300 экз. г. Мінск. 2017 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2017»

*Чацвер, 16 лютага 2017 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Здаўна ў народзе гавораць: "*Багата вясна кветкамі, а восень …*" .
**А)** палеткамі. **Б)** цукеркамі. **В)** хараводамі. **Г)** сенажацямі. **Д)** ягадамі.

**2.** Колькі ўсяго сустракаецца [с] у вершаваных радках Л. Пранчака?
*Сэрцы шчырыя гамоняць,*
*Сэрцы блізкія пяюць.*
*Над азёрнаю старонкай*
*Песні родныя плывуць…*
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**3.** Якім словам з дадзеных можна выказаць сэнс устойлівага спалучэння *пускаць пыл у вочы*?
*1) падманваць; 2) паспешліва; 3) пакрыўдзіцца; 4) моцна.*
**А)** няма патрэбнага слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**4.** У народзе існуе прыкмета: *Калі вясёлка ў небе пахілая і нізкая, то будзе … .*
**А)** вецер. **Б)** зацішша. **В)** спякота. **Г)** снег. **Д)** дождж.

**5.** Словы, якія выкарыстоўваюцца людзьмі той ці іншай прафесіі ці спецыяльнасці, называюцца … .
**А)** агульнаўжывальныя. **Б)** дыялектныя. **В)** прафесійныя.
**Г)** жаргонныя. **Д)** запазычаныя.

**6.** Слова *прыпынак* складаецца з наступных марфем.
**А) прып** – корань, **ын** – суфікс, **ак** – канчатак.
**Б) пры** – прыстаўка, **пын** – корань, **ак** – суфікс.
**В) пры** – прыстаўка, **пын** – корань, **ак** – суфікс, нулявы канчатак.
**Г) прыпын** – корань, **а** – суфікс, **к** – суфікс, нулявы канчатак.
**Д) прыпы** – корань, **н** – суфікс, **ак** – канчатак.

**7.** Выберыце словы з прапанаваных, якія маюць два аднолькавыя санорныя гукі:
*1) прыемна; 2) калоны; 3) мандарын; 4) інфармацыя; 5) ананас.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**8.** Спектакль у гонар аднаго з заслужаных удзельнікаў называецца … .
**А)** бініфіс. **Б)** бінефіс. **В)** беніфіс. **Г)** бенефіс. **Д)** беняфіс.

**9.** Палескай Амазоніяй называюць беларусы раку … .
**А)** Прыпяць. **Б)** Нёман. **В)** Дзвіна. **Г)** Свіслач. **Д)** Шчара.

**10.** Вызначце тып аднасастаўнага сказа.
*Не рабі ліхога і не бойся нікога.*
**А)** пэўна-асабовы. **Б)** няпэўна-асабовы. **В)** абагульнена-асабовы.
**Г)** безасабовы. **Д)** назыўны.

**11.** Якое з дадзеных словазлучэнняў складзена няправільна?
*1) дробны почырк; 2) дробязная цікавасць; 3) дробная капейка.*
**А)** усе словазлучэнні складзены правільна.
**Б)** усе словазлучэнні складзены няправільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**12.** Вызначце з прапанаваных правільна напісаныя словы.
*1) архіёлаг; 2) акіян; 3) піаніст; 4) рэаліст; 5) авіацыя.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**13.** У якіх прыкладах словы напішаце з вялікай літары?
*1) браты (І, і)вановы; 2) першыя (Д, д)рыгавічы;*
*3) (П, п)алац спорту; 4) (Д, д)ом адпачынку.*
**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 3, 4.

**14.** У якіх сказах на месцы пропуску(-аў) неабходна паставіць коску(-і)?
*1) Першы гром _ нібы грукат калёс _ пакаціўся па небе.*
*2) Падалі сняжынкі _ такія белыя _ што лебядзіны пух.*
*3) Новая хата была _ як цацка.*
*4) Менш чым праз хвіліну _ сястра вярнулася ў пакой.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** толькі ў сказе 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Дадзены словы:
*1) агледз..ся; 2) людз..мі; 3) рамен..чык; 4) песен..ка.*
У якіх словах на месцы пропуску напішаце мяккі знак?
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Выберыце з прапанаваных выразы, якія з'яўляюцца сінонімамі ўстойлівага спалучэння *вадзіць за нос*.
*1) браць на вудачку; 2) гуляць у ката і мышку;*
*3) ламаць шапку; 4) падпускаць лёстачкі.*
**А)** усе выразы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Выберыце сказ(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску напішаце часціцу *не*.
*1) Што толькі гэты клён __ пабачыў на сваім вяку.*
*2) Хіба ж __ былі цікавымі ўрокі літаратуры?*
*3) Дубы __ маўчалі, шумелі лісцем, асабліва калі блізка была навальніца.*
**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3.

**18.** Выдзеленыя словы ў пары словазлучэнняў *узяць ноту* ***соль*** *– марская* ***соль*** з'яўляюцца … .
**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** мнагазначнымі словамі.

**19.** У якіх парах слоў націск служыць для адрознення граматычнага значэння?
*1) рукі – рукі; 2) музыка – музыка; 3) дамы – дамы; 4) званы – званы.*
**А)** усе пары слоў. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** толькі 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**20.** Хто з вядомых мастакоў слова пераклаў раман у вершах "Яўген Анегін" і паэму "Цыганы" А. С. Пушкіна на беларускую мову?
**А)** Алесь Гарун. **Б)** Ядвігін Ш. **В)** Я. Купала.
**Г)** Максім Багдановіч. **Д)** Аркадзь Куляшоў.

**21.** У напісанні якіх слоў дапушчана памылка?
*1) выбарскі; 2) чэшскі; 3) фудбол; 4) заводскі; 5) нясвіскі; 6) французскі.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 6.

**22.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару *е*?
*1) рады..логія; 2) рады..метрычны; 3) рады..метрыя;*
*4) рады..біялогія; 5) рады..канцэрт.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**23.** Літарны склад кірыліцы адпавядаў гукавой сістэме … .
**А)** грэчаскай мовы. **Б)** лацінскай мовы. **В)** стараславянскай мовы.
**Г)** усходнеславянскіх моў. **Д)** заходнеславянскіх моў.